# «ТУТ ЖЫЦЬ МОЖНА, ТУТ ЖЫЦЬ ТРЭБА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аб сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёна кіраўніку дзяржавы далажыў першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзь Салавей. Ён прызнаўся, што адна з галін, якая найбольш адстае на сённяшні дзень, — сельская гаспадарка. Тэмпы развіцця будаўніцтва, прамысловасці неблагія, нягледзячы на страты нафтаправода «Дружба» з-за забруджанай расійскай нафты.

«Пытанне, якое нас сёння найбольш хвалюе ў прамысловасці, — «Гомсельмаш», — сказаў кіраўнік вобласці. — І мы разглядаем розныя канцэпцыі: развіццё збожжаўборачнай вытворчасці, кармаўборачнай вытворчасці і вытворчасць камбайнаў для ўборкі буракоў з лакалізацыяй 50 %».

У вобласці невялікія запасы гатовай прадукцыі, выконваюцца паказчыкі па экспарце, развіваецца турызм.

Найбольш развітая галіна — будаўніцтва. За паўгода Гомельшчына пабудавала трохі больш за палову запланаванага гадавога аб'ёму жылля. «Працуем у рамках 240-га Указа — мы цудоўна разумеем, што павінны ўсіх шматдзетных забяспечыць жыллём, — дадаў Генадзь Салавей. — Сёлета плануем забяспечыць 2000 сем'яў з 5800».

На гэта кіраўнік дзяржавы заўважыў: «Глядзіце, каб вы шматдзетныя сем'і, якія фактычна фінансуюцца з бюджэту, не сцягнулі ў Гомель. Ні ў якім разе! Гэта няправільна будзе. Шматдзетная сям'я павінна жыць у невялікім горадзе, а лепш за ўсё — у аграгарадку. Гэта і нам патрэбна — дзяржаве, і дзецям выгадна».

Ён прывёў у прыклад дом, пабудаваны для 10 шматдзетных сем'яў у Мінскай вобласці. «Задаволеныя ўсе людзі, прыехалі з буйных гарадоў і з задавальненнем там жывуць, — расказаў Прэзідэнт. — У нас аграгарадкі ўжо ў больш-менш нармальным стане, чаму там не жыць? Гэта будзе спрыяць размеркаванню рабочай сілы. Усё ж такі ў гэтых сем'ях па трое-пяцёра дзяцей».

Датычна «Гомсельмаша» Аляксандр Лукашэнка зрабіў даручэнне першаму намесніку прэм'ер-міністра Аляксандру Турчыну: «Неадкладна падключайце ўрад! «Гомсельмаш» ёсць, быў і будзе заўсёды ў краіне! Гэта 25 гадоў таму мяне запэўнівалі: маўляў, не патрэбны камбайны і «Гомсельмаш» трэба прадаць. Сёння мы бачым, што гэта добрая школа, добрая група вучоных, канструктараў. Ні ў якім разе нельга страціць гэтую школу! І тэхніка гэтая патрэбна. Але варушыцца трэба. Збірайцеся і думайце, але каб у наступным годзе мы пераста лі казаць пра «Гомсельмаш» у адмоўным плане».

Прэзідэнту далажылі, што за апошнія паўгода сітуацыя на прадпрыемстве выправілася: павялічыўся экспарт, значна зменшыліся запасы гатовай прадукцыі, толькі за чэрвень удалося прадаць 400 камбайнаў.

Аляксандр Лукашэнка даў зразумець, што прадпрыемства знаходзіцца пад асаблівай увагай кіраўніцтва краіны і яму будзе аказаная неабходная дапамога. Пры гэтым ён заўважыў, што многія сённяшнія праблемы створаны з-за памылак у кадравай палітыцы. Галоўная думка кіраўніка дзяржавы — трэба клапаціцца пра пераемнасць пакаленняў і не баяцца давяраць адказныя рашэнні больш маладым.



Фота БелТА.

## НЕ МОЖАШ — НЕ ГАДУЙ

Даклад старшыні Веткаўскага райвыканкама Паўла Сілівончыка Прэзідэнт перарваў словамі: «Гэта я ведаю. Скажы, што кепска». У адказ прагучала інфармацыя пра зніжэнне вытворчасці малака з прычыны леташняга недахопу кармоў. На канец года раён плануе выйсці па вытворчасці малака на 95 працэнтаў ад мінулага года.

Аднак Прэзідэнт адразу намацаў самую балючую праблему на Веткаўшчыне і ў цэлым па краіне — падзеж жывёлы. Аказваецца, толькі сёлета ў раёне загінула 800 галоў. Прычына, на думку мясцовага кіраўніцтва, — кармы. Але ў кіраўніка дзяржавы наконт прычын іншае меркаванне: «Не можаш накарміць, не разводзь, — сказаў ён. — Аддай тым, у каго ёсць корм. Навошта нішчыш жывёл?»

Генадзь Салавей пагадзіўся, што галоўная прычына — памылкі кіраўнікоў гаспадарак і парушэнне тэхналогій жывёлагадоўлі.

«Яшчэ раз паўтараю для ўрада: за падзеж жывёлы сядзеце ў турму! Па-мойму, 85 тысяч па мінулым годзе. Вы ўяўляеце, колькі гэта было б мяса?» — абурыўся Аляксандр Лукашэнка. Ён даручыў органам пракуратуры прыцягнуць непасрэдна займацца гэтым пытаннем і даваць вынікі. «Гэта недапушчальна! То кармы дрэнныя, то іншае. Гэта проста бесталковасць!» — рэзюмаваў Прэзідэнт.

## СА СТРАТНЫХ — У ПЕРСПЕКТЫЎНАЕ

Рэспубліканскае даччынае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Беларуснафта-Асобіна» — прыклад паспяховага ператварэння стратнага прадпрыемства ў перспектыўнае з дапамогай буйнога дзяржаўнага канцэрна. «Беларуснафта» мае падобныя гаспадаркі ў кожнай вобласці, і ва ўсіх — лепшыя, чым у сярэднім па раёне, паказчыкі. На пытанне Прэзідэнта, наколькі даводзіцца такія гаспадаркі датаваць, генеральны дырэктар РУП «Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта» Аляксандр Ляхаў адказаў: «Датацыі ёсць, але я лічу, што паляпшэнне адбываецца, і асабліва відавочна гэта на дадзеным прадпрыемстве». За паўгода прырост вытворчасці тут склаў 118 працэнтаў, і амаль пяціразовы за час апекавання з боку нафтавікоў. Складскія запасы цяпер ніжэйшыя за норму.

Канцэрн выкарыстаў у кіраванні сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі тыя ж прынцыпы, што і ў прамысловасці: склаў праграму росту, штогод уводзіць у эксплуатацыю новыя аб'екты і практычна абнавіў вытворчую базу. Цяпер у «Асобіна» стаіць задача нарасціць вытворчасць і збалансаваць ланцужок ад сыравіннай зоны да глыбокай перапрацоўкі. Пакуль што тут не хапае мясакамбіната, дзе больш глыбока перапрацоўвалася б птушка.

Прэзідэнт уважліва выслухаў інфармацыю пра палітыку «Беларуснафты» адносна даччыных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. «Глядзіце, каб гэтыя гаспадаркі не былі беднымі пасынкамі», — папярэдзіў ён Аляксандра Ляхава і параіў як мага хутчэй пабудаваць завод па больш глыбокай перапрацоўцы мяса птушкі.

## ЗАВОДЫ БУДУЦЬ ЗАХАВАНЫЯ

Другім пунктам візіту Прэзідэнта на Гомельшчыну стала поле азімага трыцікале ўнітарнага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Радуга-Агра». Тут кіраўнік дзяржавы пазнаёміўся з новай лінейкай збожжаўборачных камбайнаў айчыннай вытворчасці. Пры гэтым зноў былі закрануты праблемы холдынга «Гомсельмаш». Разам з тым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цяпер на заводзе няма разгубленасці.

«Адзіная зараз праблема — абаротныя сродкі», — прызнаўся генеральны дырэктар прадпрыемства Аляксандр Новікаў. На гэта кіраўнік дзяржавы адказаў: «Ніхто вам падарункаў рабіць не будзе. Калі трэба дапамагчы, калі ты заўтра сто камбайнаў прадаеш і штосьці вяртаеш у банк або бюджэт, канешне, грошы пазычым. «Гомсельмаш» ніхто не забудзе!»

Гэта датычыцца і іншых буйных машынабудаўнічых прадпрыемстваў краіны, незалежна ад формы ўласнасці, сказаў кіраўнік дзяржавы. «Гэта ўсё беларускае. Яны павінны даваць вынік. Заводы гэтыя будуць захаваныя, — паабяцаў Прэзідэнт. — Таму ў нечым дапаможам, але ўсё гэта павінна быць абгрунтавана і разумна. Самае галоўнае — сёння ўзяў рубель, заўтра рубель дзве капейкі вярні, многа не трэба, але падарункаў не будзе».

У гутарцы з кіраўніцтвам холдынга зайшла размова пра плённае супрацоўніцтва з Казахстанам і пра цікаўнасць апошняга да ўваходжання ў капітал беларускай кампаніі. Кіраўнік дзяржавы выказаў меркаванне, што гэта цалкам магчыма, калі ў выніку будзе выходзіць канкурэнтаздольная прадукцыя.

На полі Прэзідэнту расказалі пра мадэль газаматорнага збожжаўборачнага камбайна КЗС-4118К. Стваральнікі машыны ўпэўненыя, што за такім тыпам — будучыня. Аляксандр Лукашэнка ўчыніў, можна сказаць, вельмі строгі допыт: ці сапраўды нам патрэбныя такія машыны, у чым яны саступаюць, наколькі будуць даражэйшыя, наколькі канкурэнтаздольныя? Ён пытаўся пра гэта і ў канструктараў, і ў генеральнага дырэктара холдынга, і ў кіраўніка сельскагаспадарчага прадпрыемства, і ў працаўнікоў. Можна сказаць, што ў адказах Прэзідэнту ўсе меркаванні супадалі: вытворчасць газаматорных камбайнаў — справа перспектыўная. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што машына павінна быць даражэйшая за свае аналагі не больш чым на 10 працэнтаў і акупацца за 3,5-4 гады, тады яе вытворчасць будзе мэтазгодная.

Усяго кіраўніку дзяржавы былі паказаныя шэсць новых машын, і ён пагутарыў з камбайнерамі кожнай з іх, пры гэтым пытаўся не толькі пра перавагі і недахопы тэхнікі, але і пра асабістае жыццё, сем'і, дзяцей.

Адзін з камбайнераў Амаяк Дземярчан расказаў, што прыехаў у Беларусь з Абхазіі ў 1992 годзе. Ён запэўніў Прэзідэнта Беларусі, што яму тут жывецца добра. Дарэчы, раённая газета не аднойчы пісала пра сямейны экіпаж хлебаробаў Дземярчанаў з «Радугі-Агра», адзін з найлепшых на Веткаўшчыне.

## КРАІНЕ ПАТРЭБНЫ ГЕРОІ

Прадстаўляючы кіраўніку дзяржавы блок плавальных басейнаў у горадзе Ветка, першы намеснік міністра спорту і турызму Вячаслаў Дурной заўважыў, што мясцовае насельніцтва актыўна займаецца фізічнай культурай і спортам. 574 спартыўныя аб'екты дзейнічаюць у раёнах, якія пацярпелі ад наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. На гэта кіраўнік дзяржавы заўважыў: «Займацца фізкультурай — гэта добра, а для спорту ты адсюль хоць нешта атрымліваеш? Мы ж ствараем, грошы выдаткоўваем вялікія. Мы хоць па адным зярнятку адсюль нешта маем?» Пытанне не атрымала станоўчага адказу. Гэта не значыць, што будаваць басейны і спартыўныя пляцоўкі не трэба, але калі яны пабудаваныя, важна не супакойвацца на тым, што сюды пайшлі людзі, трэба ставіць больш амбіцыйныя задачы. «Краіне патрэбны героі», — сказаў пазней Прэзідэнт у Ветцы.

А на адрас Міністэрства спорту і турызму прагучала папярэджанне: «Токія на носе — гэта для вас будзе самы жорсткі экзамен для ўсіх!» Трэба рыхтаваць спартсменаў, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## НА ДОБРУЮ ПАМЯЦЬ

Падчас рабочай паездкі ў Веткаўскі раён Прэзідэнту падарылі ікону ручной работы і фотаальбом, у якім праілюстраваныя шматлікія візіты кіраўніка краіны ў Гомельскую вобласць. На іконе — выява Божай маці і святых заступнікаў гомельскай зямлі. Аляксандр Лукашэнка паабяцаў, што абраз зойме годнае месца ў Палацы Незалежнасці нароўні з іконай, прывезенай з вострава Валаам.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
*Гомельская вобласць.*

---

Напярэдадні падзеі

# Свята, якое запомніцца

**Пасяджэнне Нацыянальнага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства прайшло ў Слоніме пад старшынствам намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Ігара Петрышэнкі.**

Удзельнікі абмеркавалі праграму мерапрыемстваў, эскізы афармлення друкаванай прадукцыі і сцэнічных пляцовак, сцэнарны план адкрыцця свята, размяшчэнне гасцей і іншыя пытанні, паведамілі БелТА ў прэс-службе ўрада. Ігар Петрышэнка звярнуў увагу на неабходнасць дасканалай падрыхтоўкі горада Слоніма і аграгарадка Жыровічы, «каб зрабіць гэта свята для жыхароў Слоніма і Слонімскага раёна, яго гасцей самай запамінальнай падзеяй».

Цэнтральнымі падзеямі свята стануць урачыстыя цырымоніі адкрыцця і закрыцця, а таксама ўзнагароджанні пераможцаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Уся двухдзённая культурная праграма дасць жыхарам і гасцям вялікую прастору для цікавага правядзення часу. З 31 жніўня па 1 верасня пройдуць фестывалі кнігі і прэсы, падагульняльны этап рэспубліканскага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка». Беларускія і замежныя пісьменнікі абмяркуюць актуальныя пытанні сучаснай кніжнай справы за круглым сталом.

Гатоўнасць культурных і сацыяльных аб'ектаў Слоніма да прыняцця гасцей члены аргкамітэта таксама ацанілі ў час наведвання па праграме пасяджэння.

